Усё лепшае — Івану Ціцянкову? (стар. 2)
Дыктатару паказалі зубы (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 41.100
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 4 лютага 1997 | № 11 | Кошт свабодны

Шэйман лічыць, што пракуратура нарабіла мала шуму

Віктар Шэйман папракае пракуратуру, што за «ўвесь 1996 г. не было расследавана і даведзена да суда ніводнай справы, якая б мела больш-менш сур'ёзны грамадскі рэзананс».

Увогуле, стварэнне публічных скандалаў і шумных прапагандысцкіх працэсаў не ўваходзіць у непасрэдныя абавязкі пракуратуры, але ў прэзідэнцкай адміністрацыі лічаць, відаць, інакш. Выступаючы 31 студзеня на калегіі рэспубліканскай пракуратуры, дзяржсакратар Савета бяспекі В.Шэйман заявіў, што ў пракурорскіх работнікаў летам 1996 г. была магчымасць стварыць шырокі грамадскі рэзананс вакол справы, узбуджанай па фактах парушэння фінансава-гаспадарчай дзейнасці з боку кіраўніцтва «Беларусбанка». Але ж тады Шэйман чамусьці не нагадваў пракуратуры пра неабходнасць «рэзанансу».

Што ж да сённяшняй крымінальнай справы, узбуджанай супраць былой старшыні «Беларусбанка», а пасля галоўнага банкіра краіны Тамары Віннікавай, то, па словах Віктара Шэймана, у гэтай справе *«выстройваецца доўгі ланцужок вельмі высокіх службовых асобаў»*. Аднак што гэта за асобы і ці стануць яны суседзямі Віннікавай у следчым ізалятары КДБ, Шэйман удакладняць не стаў.

Б.П.

Віктар Шэйман — самы надзейны ахоўнік прэзідэнта.

Савет бяспекі шукае ворагаў у спартыўных залах

Улады рыхтуюцца да Мінскай вясны-97. Пры гэтым спрацоўвае стары прынцып: калі небяспекі няма — трэба яе прыдумаць.

Выступаючы на калегіі пракуратуры, дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман заявіў, што ў распараджэнні адпаведных органаў *«ёсць трывожная інфармацыя, што ідзе па розных каналах»*. Пры гэтым В.Шэйман не стаў удакладняць, якім чынам органы збіраюцца з гэтымі звесткамі распарадзіцца і якая сістэма інфармацыйнай каналізацыі існуе ў Савеце бяспекі. Між тым дзяржсакратару вядома, што апазіцыя нібыта ставіць задачу *«адшукаць у кожным раёне беларускай сталіцы спартыўныя залы для падрыхтоўкі своеасаблівых дружыннікаў і ахоўнікаў, якія будуць працаваць на мітынгах»*. Здавалася б, няма нічога кепскага ў тым, што апазіцыйныя структуры збіраюцца сваімі сіламі падтрымліваць грамадскі парадак на масавых мерапрыемствах, аднак у В.Шэймана, відаць, іншы пункт погляду.

Ёсць, паводле словаў В.Шэймана, і дадзеныя аб тым, што *«баевікі-беларусы рыхтуюцца, у тым ліку, і ў Чачні»*, а не так даўно *«ў Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці быў выкрыты лагер па падрыхтоўцы баевікоў»*. Удакладненняў, што гэта за «баевікі», не было.

Праваахоўныя органы, сказаў В.Шэйман, павінны не дапусціць, каб у Беларусі развіваўся «югаслаўскі» альбо «балгарскі» варыянт. Аднак балгарскі варыянт, як вядома, мірны і бяскроўны. Што ж мае на ўвазе Віктар Шэйман?

М.Н.

Сустрэчу з Віннікавай місія не атрымала

<u>У мінулую пятніцу місія Еўрапейскага Саюза завяршыла сваю працу ў Мінску</u>

У склад дэлегацыі ўваходзілі юрысты і дыпламаты. Да сярэдзіны гэтага месяца яны падрыхтуюць спецыяльны даклад, які будзе абмеркаваны 24 лютага на Савеце міністраў ЕС. Як паведаміў у час прэс-канферэнцыі кіраўнік дэлегацыі, член Дзяржсавета Нідэрландаў Ары Коста, *«асаблівую ўвагу місія надавала рэферэндуму і падзеям, якія яго суправаджалі»*.

Нагадаем, што Еўрапейскі Саюз бярэ свой пачатак у 1951 годзе, калі 6 дзяржаваў (Бельгія, Францыя, Італія, Люксембург, Нідэрланды і ФРГ) у Парыжы заснавалі Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі. Сёння ЕС аб'ядноўвае 15 краінаў, у якіх жыве 370 мільёнаў чалавек. З першых гадоў існавання Еўрапейскі Саюз з'яўляецца не толькі эканамічнай супольнасцю, але і палітычнай сілай, якая выступае ў абарону дэмакратычных каштоўнасцяў. ЕС пашырае эканамічнае супрацоўніцтва з посткамуністычнымі краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія ажыццяўляюць рынкавыя рэформы.

Яшчэ за месяц да лукашэнкаўскага рэферэндуму паслы краін Еўрапейскага саюза, акрэдытаваныя ў Мінску, перадалі беларускаму міністэрству замежных справаў ноту, у якой гаварылася, што для таго, *«каб вынікі рэферэндуму былі прызнаныя ўнутры Беларусі і за яе межамі, неабходна захоўваць канстытуцыйнасць працэдураў рэферэндуму»*. У гэтай жа ноце звярталася ўвага беларускіх уладаў на тое, што *«плебісцыт павінен быць праведзены толькі пасля поўнага і адкрытага абмеркавання, у якім змогуць удзельнічаць усе зацікаўленыя бакі, пры свабодным асвятленні сродкамі масавай інфармацыі»*. Як папярэджваў Еўрапейскі Саюз, усякія *«спробы падарваць ці перашкодзіць працы парламента альбо абмежаваць ягоную дзеяздольнасць будуць лічыцца несумяшчальнымі з еўрапейскімі дэмакратычнымі прынцыпамі»*. У гэтай жа ноце паслы краінаў ЕС падкрэслілі, што любая канстытуцыя павінна адпавядаць *«міжнародным нормам»*.

Нельга не згадаць і рэзалюцыю Еўрапейскага парламента (адной са структураў ЕС), якая заклікала прэзідэнта Лукашэнку спыніць аўтарытарныя спробы кіравання, захоўваць законы і правы чалавека, пачаць эканамічныя рэформы. У адваротным выпадку Еўрапарламент не ратыфікуе пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю. Прэзідэнт Лукашэнка праігнараваў гэтыя папярэджанні.

У снежні мінулага года беларускі прэзідэнт ездзіў на саміт АБСЕ ў Лісабон. Лукашэнка абвінаваціў еўрапейскіх палітыкаў, што яны *«не ведаюць фактаў»*. Тады кіраўніцтва ЕС прапанавала прыслаць спецыяльную місію для вывучэння сітуацыі. Спачатку прэзідэнт Лукашэнка адмовіўся, але ўрэшце згадзіўся прыняць у Мінску місію Еўрапейскага Саюза. Місія ЕС прыбыла ў той час, калі пасля незаконнага рэферэндуму практычна завяршылася фарміраванне нелегітымных уладных структураў. Цяпер Еўрапейскі Саюз мае магчымасць ацаніць усё зробленае прэзідэнтам Лукашэнкам.

На здымку: кіраўнік місіі Еўрасаюза Ары Коста на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Падчас прэс-канферэнцыі члены місіі Еўрапейскага Саюза адзначылі, што на працягу тыдня кожны дзень, з раніцы да позняга вечара, праводзілі *«складаную, інтэнсіўную работу»*. Адбыліся дзве сустрэчы з прэзідэнтам Лукашэнкам (у першы і апошні дзень візіту), прычым на абодвух аўдыенцыях юрысты місіі цікавіліся прававымі аспектамі і працэдурай правядзення рэферэндуму. Каля 60 чалавек мелі гутарку з дэлегацыяй Еўрасаюза — гэта члены ўрада, дэпутаты лукашэнкаўскай палаты, Вярхоўнага Савета, былыя высокапастаўленыя афіцыйныя асобы, прадстаўнікі недзяржаўных арганізацый, прафсаюзаў. Часам прыватныя асобы звярталіся да місіі са сваімі пытаннямі.

Частку сустрэчаў місія ЕС правяла на тэрыторыі нямецкай амбасады, каб, па словах Ары Коста, *«быць незалежнымі»*. (Сёння прэзідэнцтва ў Еўрапейскім Саюзе мае Каралеўства Нідэрланды, а паколькі гэтая краіна не мае свайго пасольства ў Мінску, яе інтарэсы прадстаўляе Германія). Па словах Ары Коста, *«місія мела доступ да інфармацыі без абмежаванняў, было шмат пытанняў і на ўсе адказы атрыманыя. Спектр быў вельмі шырокі. Сабрана шмат фактаў, якія даюць падставы для адпаведных высноваў»*.

Кіраўнік місіі ЕС адзначыў на прэс-канферэнцыі, што не адбылося толькі двух запланаваных сустрэчаў — з былым Генеральным пракурорам Васілём Капітанам (ён цяпер заняты асабістымі справамі, і ў Мінску адсутнічаў), а таксама з экс-старшынёй Нацыянальнага банка Тамарай Віннікавай. Як сказаў Ары Коста, *«папярэдне місіі было дазволена сустрэцца з Віннікавай, але потым органы юстыцыі не дазволілі пагаварыць»*. Наконт гэтага інцыдэнту карэспандэнт СВАБОДЫ звярнуўся па каментарыі ў Генеральную пракуратуру, дзе патлумачылі, што паводле закона толькі следчы дае дазвол на сустрэчу. Следчы па асабліва важных справах Пётр Рэдзька сказаў, што *«ні родным, ні службовым асобам, ні іншаземцам сустрэчы не будуць дазволеныя. Пакуль справа ў мяне, да Віннікавай ніхто не падыдзе, нават прэзідэнт»*. Ні прэс-служба Генеральнай пракуратуры, ні следчы не змаглі канкрэтна адказаць, хто даваў папярэдні дазвол на сустрэчу з Віннікавай.

На прэс-канферэнцыі місія ЕС трымалася ўпэўнена, але адмаўлялася ад канкрэтных ацэнак. Ары Коста толькі адзначыў, што *«іншы раз адказы службовых асоб былі вельмі доўгімі і было цяжка вычленіць рэальны адказ»*. Як юрысту, яму невядомыя ў еўрапейскай практыцы прыклады папярэдняга галасавання да прызначанай даты рэферэндуму. Ары Коста падкрэсліў, што насуперак заявам афіцыйнай прапаганды, Захад атрымоўвае інфармацыю пра падзеі ў Беларусі не толькі з апазіцыйнай прэсы. Пасольствы заходнееўрапейскіх краінаў у Беларусі прадстаўляюць інфармацыю, якая базіруецца не толькі на інфармацыі з апазіцыйных СМІ, але і на афіцыйных крыніцах. На пытанне прэзідэнта Лукашэнкі, што думае Захад пра сітуацыю ў Беларусі, Ары Коста адказаў, што *«Беларусь успрымаецца на Захадзе як вельмі важная краіна»*.

А наколькі сённяшняя Беларусь адпавядае еўрапейскім стандартам дэмакратыі, Еўрапейскі Саюз у асобе Савета міністраў ЕС адкажа Лукашэнку праз некалькі тыдняў.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Бензін будуць прадаваць за долары

Нацыянальны банк Беларусі дазволіў дзяржаўнаму канцэрну «Белнафтапрадукт» прадаваць паліва за валюту.

Гэта азначае, што на аўтазаправачных станцыях, якія знаходзяцца ва ўласнасці канцэрна, замежным грамадзянам (у тым ліку і прадстаўнікам міжнародных перавозчыкаў) бензін і салярку можна будзе прадаваць за цвёрдую валюту і расійскія рублі. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення эканомікі і фінансаў «Беланафтапрадукта» А.Філонаў. Разам з тым Нацбанк патрабуе выконваць шэраг умоваў. Сярод іх, у прыватнасці, наяўнасць адпаведнага дагавора з банкам на прыём наяўнай замежнай валюты; абавязковае прад'яўленне пакупніком замежнага пашпарта і тэхнічнага пашпарта транспартнага сродку; абсталяванне АЗС неабходнымі тэхнічнымі сродкамі для праверкі купюр і інш.

Пры гэтым Нацыянальны банк падкрэслівае, што нікому не можа быць адмоўлена ў пакупцы паліва за беларускія рублі.

БелаПАН

Чыкін дазволіў «пікет пустых каструль»

У мінулую пятніцу каля будынка міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання адбыўся пікет.

Акцыя насіла назву «Пікет пустых каструль» і праводзілася ў знак пратэсту супраць збяднення насельніцтва.

Амаль тры дзесяткі пікетчыкаў трымалі плакаты, на адным з іх было напісана: *«Лукашэнка і Ціцянкоў, аддайце народу масла!»*. Пры гэтым удзельнікі акцыі гучна грымелі пустымі каструлямі і міскамі, заклікаючы чыноўнікаў міністэрства выйсці да народа. Акцыя доўжылася амаль дзве гадзіны.

Пікет быў санкцыяваны гарвыканкамам. Дазвол на правядзенне акцыі падпісаў нядаўна прызначаны намеснік старшыні Мінгарвыканкама Віктар Чыкін.

БелаПАН

Гінуць людзі, гарыць маёмасць

За мінулы тыдзень у Беларусі здарылася 232 пажары, страты ад якіх склалі больш за 2 млрд. рублёў. У агні загінула 25 чалавек.

Самы вялікі ўрон быў нанесены ў выніку пажара на трансфарматарнай электрападстанцыі ў Бярозе (Брэсцкая вобласць). Агонь там узнік у ноч з 30 на 31 студзеня па прычыне кароткага замыкання. Амаль на суткі былі пазбаўленыя электрычнасці камбінат сілікатных вырабаў, мясакансервавы камбінат, завод мінеральнай ваты, а таксама халадзільнік сыракамбіната.

Анатоль МІРСКІ

Наступны нумар газеты СВАБОДА пытайцеся ў сераду 5 лютага

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Усё лепшае – Івану Ціцянкову?

Страсць галоўнага прэзідэнцкага «завхоза» Івана Ціцянкова да лепшых будынкаў сталіцы даўно вядомая. Цяпер кіраўнік справамі адміністрацыі прэзідэнта паклаў вока на дзіцячы сад № 33, уласнікам якога з'яўляецца міністэрства ўнутраных справаў.

Садок месціцца ў сасновым бары побач са сталічным мікраraёнам Сцяпянка, у будынку былой дачы сталінскага наркома НКВД Л.Цанавы. Дзіцячая ўстанова працуе кругласутачна цэлы тыдзень з панядзелка па пятніцу, што вельмі зручна для міліцыянтаў, у якіх ненармаваны працоўны дзень.

І вось у канцы снежня мінулага года на тэрыторыю садка з цэлай світай сваіх «гаспадарнікаў» прыехаў І.Ціцянкоў. Уся кампанія спрытна абмерала плошчу аб'екта, сфатаграфавала будынкі і распытала выхавальніц, чые дзеці наведваюць садок.

У пачатку студзеня на імя міністра ўнутраных справаў Валянціна Агальца прыйшоў ліст з упраўлення справамі прэзідэнцкай адміністрацыі, у якім міністру прапаноўвалася разглядзець мэтазгоднасць бюджэтнага фінансавання дзіцячага садка № 33. В.Агалец адказаў Ціцянкову, што міністэрства гатовае фінансаваць дзіцячую ўстанову, паколькі яна мае санаторны характар і паліклініка МУС накіроўвае туды на аздараўленне хворых дзяцей супрацоўнікаў міністэрства. Далей ведамства Ціцянкова пачало закідваць лістамі намесніка міністра ўнутраных справаў па тыле, а таксама раённы аддзел народнай асветы. У іх патрабавалася даць упраўленню справамі звесткі, колькі дзяцей супрацоўнікаў МУС наведвае садок і знайсці магчымасць размяшчэння дзяцей у іншых дзіцячых дашкольных установах.

Адчуўшы, што над садком навісла пагроза закрыцця, бацькі дзяцей звярнуліся да памочніка Лукашэнкі Сяргея Посахава. Той прыняў дэлегацыю бацькоўскага камітэту, абяцаў разабрацца і дакласці іх патрабаванні асабіста прэзідэнту. Наступную сустрэчу з бацькамі палкоўнік Посахаў прызначыў на сераду, 29 студзеня, але ў прызначаны тэрмін прыняць іх адмовіўся.

Тым часам на свет з'явілася прэзідэнцкае распараджэнне № 17 аб перадачы комплекса будынкаў дзіцячага садка № 33 з баланса міністэрства ўнутраных справаў на баланс упраўлення справамі адміністрацыі прэзідэнта. Памяшканні садка І.Ціцянкоў збіраецца выкарыстоўваць пад асабнякі для прыёмаў дыпламатычных місій.

На тэрмінова скліканым сходзе бацькі вырашылі распачаць пікетаванне рэзідэнцыі Лукашэнкі. Новы намеснік міністра МУС палкоўнік А.Чванкін, які прысутнічаў на сходзе, заклікаў бацькоў не палітызаваць сітуацыю, абяцаў неяк вырашыць пытанне, хаця і падкрэсліваў, што міліцыя — людзі ў пагонах, паднявольныя і падпарадкоўваюцца прэзідэнту. Дэпутат Генадзь Карпенка паабяцаў дапамагчы адстаяць дзіцячы садок, але нагадаў бацькам, што далейшы лёс іх дзяцей залежыць у першую чаргу ад іхняй пазіцыі. У мінулы чацвер і пятніцу некалькі бацькоў са сваімі дзецьмі некалькі гадзін стаялі насупраць будынка прэзідэнцкай адміністрацыі з плакатамі, на якіх было выведзена: *«Не забирайте детский сад!», «Детский сад — детям», «Детский сад не отдадим»*.

Ахова прэзідэнцкага палаца са спачуваннем паставілася да пікету сваіх калегаў. Толькі адзін найбольш верны служака-маёр прыгразіў адвезці пікетчыкаў разам з дзецьмі ў суд, але астатнія міліцыянты не падтрымалі ягонага «должностного рвения».

Як паведаміў карэспандэнту СВАБОДЫ старшыня бацькоўскага камітэту дзіцячага садка № 33 Васіль Філіпчык, цяпер бацькі выпрацоўваюць план далейшых дзеянняў. Сёння яны збіраюцца прывесці да будынку прэзідэнцкай адміністрацыі ўсіх 130 дзяцей, якія наведваюць садок. Бацькі настроеныя вельмі рашуча і ў выпадку, калі ўлады паспрабуюць выселіць дзіцячую ўстанову, нават гатовыя забарыкадавацца ў будынку садка.

Вось як клапоціцца прэзідэнт, кажучы ягонымі словамі, «о моем народе». Ён ужо ашчаслівіў «жэншчын» і пенсіянераў, цяпер дайшла чарга да дзяцей. Але лозунг савецкіх часоў «Усё лепшае — дзецям» перастаў адпавядаць рэаліям сённяшняга дня, і яго варта трохі перафразаваць: «Усё лепшае — упраўленню справамі прэзідэнта».

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

На здымку: у мінулую пятніцу бацькі разам з дзецьмі прыйшлі да прэзідэнцкай адміністрацыі патрабаваць каб дзіцячы сад застаўся дзецям.

«Народную граМаду» нарэшце зарэгістравалі

29 студзеня міністэрства юстыцыі афіцыйна зарэгістравала Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю («Народная грамада»).

БСДП была створаная летам 1992 года ў выніку зліцця Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Партыі народнай згоды. Між тым, на працягу паўгода дэ-юрэ БСДГ і ПНЗ значыліся раздзельнымі суб'ектамі беларускай палітыкі, хаця дэ-факта існавала адзіная БСДП.

Тым часам лідэр беларускіх сацыял-дэмакратаў Мікола Статкевіч наведаў Кіеў. Асноўнай мэтай візіту быў удзел у завяршальным этапе стварэння Міжнароднага камітэта ў абарону беларускай дэмакратыі. Камітэт будзе базіравацца ў Кіеве, узначаліць яго лідэр украінскіх сацыял-дэмакратаў Васіль Анопенка. Камітэт ствараецца пры актыўнай падтрымцы шэрагу буйных міжнародных арганізацый — такіх, як Еўрапейскі форум, Фонд Улафа Пальме, Рэспубліканскі інстытут ЗША.

Б.П.

Беларуская АЭС – праз шэсць гадоў?

Беларусь мае намер увесці ў дзеянне першую АЭС да 2003 года.

Пра гэта заявіў дырэктар Інстытута праблем энергетыкі АН Беларусі А.Міхалевіч. Выступаючы ў Кіеве на паседжанні «круглага стала» «Ядзернае заканадаўства: стан і перспектывы», ён паведаміў, што ў бліжэйшы час Беларусь далучыцца да Венскай канвенцыі аб ядзернай бяспецы 1963 г. На думку А.Міхалевіча, сёння насельніцтва Беларусі, якое моцна пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, ужо не адмаўляе ядзерную энергетыку як такую. Паводле А.Міхалевіча, змены ў грамадскай думцы адбыліся, у прыватнасці, і таму, што Беларусь мае цяпер, па сутнасці, толькі адну крыніцу энергазабеспячэння — Расію, якой завінавацілася 1,5 млрд. долараў, што роўна суме дзяржаўнага бюджэту краіны.

БелаПАН — УНІАН

Для каго стараецца беларуская мытня?

Брэсцкая мытня «Заходні Буг» у 1996 г. пералічыла ў бюджэт Расійскай Федэрацыі 105 млн. 447 тыс. долараў ЗША, што значна больш за аналагічныя паступленні ў 1995 годзе.

Плацяжы ў беларускі бюджэт таксама ўзраслі — ажно на на 450% — і склалі летась 230 мільярдаў рублёў і 24 мільёны долараў. І ўсё ж атрымліваецца, што для Расіі брэсцкія мытнікі «зарабілі» амаль у 10 разоў больш, чым для нашай дзяржавы.

БелаПАН

Прысяга з бацюшкам і ксяндзом

На цырымонію прыняцця прысягі маладымі салдатамі ў 6-ю механізаваную брыгаду ў Гродне запрасілі не толькі праваслаўнага бацюшку, але і ксяндза.

Камандванне вырашыла так зрабіць, бо ў брыгадзе служыць шмат мясцовых хлопцаў з каталіцкіх сем'яў. У іншых воінскіх частках пакуль запрашаюць выключна бацюшак, што дыскрымінуе вернікаў іншых канфесій.

С.А.

«Лікбез» для маладых актывістаў

Шмат маладых людзей ўдзельнічае ў вулічных акцыях апазіцыі, многія з іх ужо маюць багаты досвед сутычак з міліцыяй, арыштаў і судоў. Але вельмі часта маладыя людзі слаба ведаюць свае элементарныя грамадзянскія правы і не арыентуюцца як сябе паводзіць у сітуацыі, калі іх затрымала міліцыя.

Беларускі хельсінкскі камітэт вырашыў правесці шэраг семінараў з мэтай пашырэння прававой культуры сярод палітычна актыўнай моладзі. Першы такі семінар пад назвай «Правы чалавека: моладзь і закон», на які былі запрошаныя прадстаўнікі Акадэміі міліцыі, Мінскага гарадскога ўпраўлення ўнутраных справаў і Канстытуцыйнага суда, прайшоў 29 студзеня ў Мінску.

На жаль, чаканай шырокай дыскусіі і абмену думкамі не адбылося. Толькі былы суддзя КС Міхаіл Пастухоў і ад'юнкт Акадэміі міліцыі Анатоль Савянок здолелі даходліва і аргументавана выкласці сваю пазіцыю.

М.Пастухоў, у прыватнасці, акцэнтаваў увагу на тым, што подпісы Беларусі стаяць і пад Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, і пад выніковым дакументам Хельсінкскага паседжання краін АБСЕ 1975 г., таму кожны факт парушэння правоў асобы ў нашай краіне можа стаць прадметам разгляду Еўрапейскім трыбуналам, і гэтага трэба дамагацца. Тым больш, што фактаў дастаткова. Старшыня Беларускага хельсінкскага камітэту Таццяна Процька паказала цікавы дакумент: копію пратакола затрымання грамадзяніна, які быў схоплены міліцыяй за тое, што распаўсюджваў у Магілёве Дэкларацыю правоў чалавека. Прадстаўнікі праваахоўных органаў спрабавалі тлумачыць падобныя інцыдэнты тым, што ў міліцыю апошнім часам прыйшло шмат армейскіх афіцэраў, якія не разумеюць тонкасцяў аператыўнай работы.

Выкладчык Акадэміі міліцыі Вячаслаў Балотнікаў спрабаваў на семінары «па-бацькоўску» павучаць моладзь. На яго думку, хлопцам трэба *«ўлоўліваць сітуацыю, і калі шэсце ідзе не туды, куды патрабуе міліцыя, лепш не ісці за правакатарамі»*. На заўвагу маладога чалавека, што людзі выходзяць на вуліцы, каб адстойваць свае правы, і яны не могуць паводзіць сябе як алавяныя салдацікі, сівавалосаму прафесару практычна не знайшлося што адказаць. Прадстаўнікі міліцыі больш наракалі на невялікія зарплаты, праблемы з жыллём і на тое, што дэманстранты не дораць ім кветак *(«як у Бялградзе»)*.

Т.Процька спадзяецца, што наступныя семінары, якія плануецца правесці ў абласных цэнтрах, пройдуць больш паспяхова. Шкада толькі, што высокія міліцэйскія чыны на словах так многа гавораць аб неабходнасці правядзення тлумачальнай работы сярод моладзі, а на справе далёка не ўсе з іх здольныя весці элементарныя дыскусіі.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

На вуліцы холадна міліцыі, але не пікетчыкам

У Магілёве прайшоў пікет, прысвечаны ўгодкам Магілёўскага паўстання 1661 года супраць войскаў рускага цара.

У 1655 г. магілёўцы адчынілі гарадскія брамы перад маскоўскімі войскамі. Ім абяцалі, што як жыў горад раней, так і будзе жыць. Трэба толькі прызнаць маскоўскага цара. За 6 год, што горад знаходзіўся пад расійскай акупацыяй, мясцовыя жыхары добра зведалі кошт абяцанняў усходняй суседкі. Усе тыя правы і прывілеі, якія меў Магілёў у Вялікім княстве Літоўскім, былі адмененыя маскоўскімі гаспадарамі. 1 лютага 1661 г. выбухнула паўстанне. Пасля воклічу войта Леановіча: «Пара!» — магілёўцы напалі на 3-тысячны маскоўскі гарнізон. Пасля паўстання маскоўскі патрыярх Нікан пракляў горад на Дняпры. Магілёў увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага і атрымаў такія ж эканамічныя правы, што і сталіца княства Вільня.

Сенняшнія дэмакратычныя арганізацыі Магілёва скарысталі гадавіну паўстання, каб яшчэ раз нагадаць усім павучальную гісторыю стасункаў з Расіяй і заклікаць да ратавання беларускай незалежнасці. Пікет прыцягнуў увагу людзей. Да яго сабралася каля 100 чалавек. Пікет не спадабаўся міліцыі: начальнік Цэнтральнага РАУС Магілёва палкоўнік Аляксандр Церахаў асабіста спрабаваў прагнаць аднаго з удзельнікаў акцыі, 30-гадовага рабочага Уладзіміра Цурпанава, які трымаў бел-чырвона-белы сцяг. Праўда, бравы палкоўнік так і не схацеў патлумачыць, што парушаў Цурпанаў, заявіўшы, што можа гэта зрабіць толькі ў міліцэйскім пастарунку. Маўляў, на вуліцы тлумачыць *«холадна і няёмка»*. Карэспандэнту СВАБОДЫ начальнік РАУС паведаміў, што на Цурпанава будзе складзены пратакол *«за арганізацыю несанкцыяванага мітынга»*. «Парушальніку» пагражае штраф да 600 тысяч рублёў.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Калі вы маеце электронную пошту, то свежы нумар СВАБОДЫ вы можаце чытаць напярэдадні выхаду газеты ў свет.

Кошт электроннай падпіскі ў межах Беларусі — 7 USD у месяц.

Даведкі па тэл. 236-89-40

29 тысяч студэнтаў латаюць бюджэт

Цяпер у Беларусі дзейнічае больш за 30 недзяржаўных вышэйшых навучальных установаў, дзе вучыцца каля 29.000 студэнтаў.

Па словах старшыні Саюза прадпрымальнікаў Беларусі Уладзіміра Карагіна, гэтыя прыватныя ВНУ толькі ў 1996 г. выплацілі ў дзяржаўны бюджэт больш за 30 млрд. рублёў падаткаў. Сп.Карагін таксама адзначыў, што ў большасці краінаў цывілізаванага свету падобныя ВНУ вызваленыя ад дзяржаўных фінансавых спагнанняў, таму што ўлады зацікаўленыя у развіцці адукацыі. Нашая ж дзяржава дбае перш за ўсё пра латанне дзірак у бюджэце.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

Грошы слухачоў – для школы-інтэрната

Вядомы гродзенскі бард Віктар Шалкевіч падчас дабрачыннага гастрольнага турнэ па Беларусі сабраў 3 мільёны рублёў.

Сродкі, ахвяраваныя слухачамі, спявак перадаў Мсціслаўскай школе-інтэрнату глуханямых дзяцей.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
4 лютага 1997 г., № 11

Диктатору показали зубы

Действия Лукашенко стали объектом пристального внимания министра внутренних дел (правда, бывшего)

На последнем заседании оппозиционного Национального экономического совета среди прочих был поднят и вопрос, не имеющий непосредственного отношения к экономике: председатель комитета по национальной и экономической безопасности, бывший министр внутренних дел Юрий Захаренко внес предложение разработать фундаментальный документ, посвященный государственным, экономическим и иным преступлениям президента Лукашенко. С «благословения» Национального экономического совета комитет, возглавляемый Ю.Захаренко, и займется этой работой. Помимо этого, Ю.Захаренко предложил Верховному Совету создать *«специальную комиссию по смещению президента в связи с совершенными преступлениями»*.

Это предложение вначале обсудил Президиум ВС. Одобрив идею в целом, Президиум решил подкорректировать название нового органа, и на заседание Верховного Совета 29 января был вынесен вопрос *«О создании комиссии по правовой оценке нарушений Конституции и законов Республики Беларусь президентом Лукашенко»*.

Докладывая по этому вопросу, депутат Виктор Гончар отметил, что в случае, если специальная комиссия ВС примет заключение о том, что президент страны совершил преступление, и это заключение будет утверждено Верховным Советом, то согласно действующей Конституции, это станет основанием для прекращения осуществления президентом своих полномочий. После этого должно последовать решение, принятое Верховным Советом квалифицированным большинством, а затем рассмотрение дела по существу обвинения Верховным судом. *«Возобновление процесса импичмента находится в контексте нашей основной задачи — восстановление действия Конституции 1994 г.»*, — подчеркнул В.Гончар.

Депутаты Верховного Совета, руководствуясь ст.104 Конституции, приняли решение создать специальную комиссию. Председателем комиссии избран В.Гончар, в состав ее вошли 10 депутатов самых разных политических направлений. Исходя из принципа «страна должна знать своих героев» (хотя в данном случае пока можно говорить только о кандидатах на это звание), перечислим этих бойцов передового отряда борьбы с диктатурой поименно: А.Добровольский, П.Данейко, А.Лебедько, А.Климов, В.Щукин, П.Знавец, Г.Тереня, В.Савичев. В.Нистюк, Г.Прокопович.

Надо заметить (теперь уже без иронии), что в условиях краха экономики и международной изоляции Беларуси деятельность специальной комиссии (если она будет активной как по существу, так и в плане информирования населения) может привлечь внимание общественности не хуже, чем в свое время антикоррупционная комиссия, когда ее возглавлял нынешний диктатор Беларуси.

Парламентская комиссия во главе с депутатом Виктором Гончаром должна будет выяснить, совершил ли президент страны преступление.

Бывший министр внутренних дел Юрий Захаренко считает, что материала достаточно, чтобы предъявить обвинение.

На вопросы корреспондента СВАБОДЫ отвечает инициатор создания комиссии Юрий Захаренко.

— Почему Вы считаете важным создание такой комиссии?

— Прежде всего потому, что наконец-то будет дана правовая оценка Лукашенко как лицу, совершившему целый ряд нарушений Конституций и законов. До сих пор подобные оценки имели в основном эмоциональный характер.

— Вы располагаете какими-то конкретными материалами на этот счет?

— Да, в комитете по национальной и экономической безопасности Национального экономического совета имеется ряд материалов, однако до определения порядка работы парламентской комиссии я не хотел бы говорить о них подробно. Хотя, собственно, даже тех материалов, которые уже публиковались, достаточно, чтобы предъявить обвинение этому человеку. А в результате деятельности комиссии перечень преступлений режима, без сомнения, будет весьма существенно пополнен. При этом очень важно, что парламентская комиссия — это легитимная политическая форма расследования.

— Будет ли деятельность парламентской комиссии иметь какие-то юридические последствия, кроме наглядной демонстрации перед гражданами Беларуси и мировым сообществом сущности диктаторского режима?

— Верховный суд обязан будет рассмотреть доказательства, представленные комиссией ВС по обвинению президента Лукашенко. Посмотрим, как г-н Сукало вместе с пленумом Верховного суда исполнит свой долг. А если он этого не сделает, то должен понимать, что в Уголовном кодексе предусмотрена ответственность за неисполнение должностным лицом своих функциональных обязанностей. Я убежден, что день, когда придет правовая, конституционная власть, неизбежно настанет.

— Будет ли комиссия заниматься вопросом прав человека?

— Конечно. Мы будем внимательно отслеживать нарушения прав человека — любые нарушения в этой области означают, что либо власть бездействует, либо сама эти нарушения совершает. Каждый человек может к нам обратиться. Первоначальный адрес следующий: *220033, г.Минск, а/я 194, Захаренко Ю.Н.* Более того, в ближайшее время будет подготовлено письмо за подписью председателя комиссии В.Гончара во все органы власти и общественные организации о начале работы этой парламентской комиссии — с предложением предоставить материалы (если таковые у них имеются) о злоупотреблениях, о преступлениях «вертикали» и высших эшелонов власти. Соответствующим должностным лицам мы будем направлять эти материалы, которые они обязаны будут рассмотреть.

Вадим КАЗНАЧЕЕВ

КОШТЫ РЭКЛАМНАЙ ПЛОШЧЫ ў газеце **СВАБОДА:**

у рэкламным блоку — **33000** руб./см²
на асобнай паласе — **40000** руб./см²
у тэлевізійнай праграме — **44000** руб./см²
на першай паласе — **110000** руб./см²

Даведкі па тэл. 236-89-40

Лені Фішар: «Парламент павінен выбірацца, а не прызначацца»

Са старшынёй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Лені Фішар гутарыць Юрась Свірко

— Спадарыня Фішар, 31 студзеня, у апошні дзень працы зімовай сесіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, бюро ПАСЕ вярнулася да беларускай праблемы. Што было вырашана?

— На бюро мы абмяркоўвалі рэакцыю на нашае рашэнне прыпыніць (падкрэсліваю: прыпыніць, а не ліквідаваць) статус Беларусі як спецыяльна запрошанай краіны. Многія адрэагавалі на гэтае рашэнне, і асабліва з расійскага боку гучала крытыка. З розных бакоў паступае розная рэакцыя, але сітуацыя паказвае, што нашае рашэнне аб прыпыненні статуса Беларусі як спецыяльна запрошанай у ПАСЕ было прынятае на сур'ёзных падставах. Разам з тым у мяне складваецца ўражанне, што Беларусь — гэта краіна, якая па-ранейшаму зацікаўленая ў супрацоўніцтве з Саветам Еўропы.

Мы таксама абмеркавалі магчымыя крокі, якія мы маглі б зрабіць у будучым. Толькі што я атрымала прапанову Расіі правесці спецыяльны семінар па Беларусі ў Ноўгарадзе. Я думаю, нам варта глыбей вывучыць сітуацыю, а таксама прыняць пад увагу ліст МЗС Беларусі, якое мы толькі што атрымалі. У інтэрв'ю не прынята каментаваць дыпламатычныя лісты, але скажу, што яно выклікае пэўную цікавасць.

— Якія ўмовы вяртання Беларусі ў Савет Еўропы?

— Мы не складаем спісы ўмоваў. Але адназначнае патрабаванне — мець выбраны парламент, а не прызначаны. Нават калі хтонебудзь стане пярэчыць, што так, а не інačай прадугледжваецца канстытуцыяй. Падобныя довады азначаюць толькі адно: канстытуцыя не адпавядае дэмакратычным стандартам.

— Гэта значыць, што Беларусі патрэбная новая канстытуцыя?

— Падобна, што так. Мы ведалі, што Канстытуцыя 1994 г. патрабавала рэструктурызацыі, але ж не адкат назад. Нельга было выносіць вельмі складаныя пытанні на рэферэндум без сапраўднага тлумачэння ягоных наступстваў для парламентарызму.

— Ці прызнаеце Вы стары беларускі парламент — Вярхоўны Савет?

— Мы лічым, што папярэдні — я хачу сказаць, законны — парламент на сённяшні дзень пазбаўлены магчымасці прымаць законы. Гэта адна з прычын, чаму мы прынялі рашэнне прыпыніць статус Беларусі як спецыяльна запрошанай.

— Калі можа адбыцца спецыяльны семінар у Ноўгарадзе?

— Мы павінны добра вывучыць сцэнарый і ўмовы гэтага семінара. Я магу зразумець зацікаўленасць Расіі. Але ўсё вырашае Парламенцкая асамблея Савета Еўропы. Мы ўсё сур'ёзна вывучым і знойдзем варыянт, дзе, як, калі і з кім сустрэцца па праблеме Беларусі. У складзе місіі ЕС у Мінску знаходзілася два эксперты Савета Еўропы. Можаце быць упэўненыя, што іх справаздачы будуць дэталёва вывучаныя, перш чым бюро ПАСЕ прыме рашэнне. Мы не спяшаемся.

Концевенко вновь при Шеймане

Одной из ключевых фигур в ведомстве Виктора Шеймана стал Сергей Концевенко. 23 января указом президента он назначен на должность заместителя государственного секретаря Совета безопасности. История карьеры этого чиновника с ее взлетами и падениями заслуживает особого внимания.

Кадровый сотрудник Комитета госбезопасности СССР подполковник Концевенко объявился в Беларуси на исходе 1992 года. Следует отметить, что для переезда из Москвы в Минск он выбрал отнюдь не самое удачное время. Более-менее престижные должности в аппарате спецслужбы, дающие шанс для кадрового роста, были заняты. Окунуться в рутинную оперативную работу, связанную с ненормированным рабочим днем и туманными перспективами, желания не было. Не хватавший звезд с неба чекист, при отсутствии влиятельного протеже вынужден был довольствоваться скромной ролью преподавателя в Институте национальной безопасности. Даже заявления о якобы выполняемой им какой-то особой миссии в Карабахе и связях с российскими политиками не смогли повлиять на прежнее руководство КГБ Беларуси.

Не исключено, что сидеть в ИНБ Концевенко пришлось бы до самой пенсии. Однако грянули первые в Беларуси президентские выборы, которые круто изменили его судьбу. Будущий заместитель Шеймана вовсе не состоял в предвыборном штабе Александра Лукашенко и вообще был как бы в стороне от политики.

Но потребность в услугах Концевенко возникла сразу после выборов в связи с необходимостью добывания компромата на сторонников проигравшего Вячеслава Кебича. Из числа сотрудников силовых ведомств были сформированы инспекционные группы, задачей которых являлась проверка министерств и ведомств. Разумеется, что итоги поездок новоявленных ревизоров, которые ставили однозначный диагноз — «снять с должности» были известны заранее. Сергей Концевенко оправдал возложенное на него доверие при проверке Главного управления пограничных войск.

Затем наступил трехмесячный период в его карьере, который коллеги метко окрестили «подвешенным» состоянием. Лишь в октябре 1994 года Концевенко назначается начальником отдела аппарата Совета безопасности. Тогда же судьба сводит его с помощником Шеймана г-ном Миклашевичем, который затем сыграет определенную роль в карьере Концевенко.

В течение двух лет Сергей Концевенко являлся ничем не приметной фигурой, готовым выполнить любое поручение своего шефа. Злые языки утверждают, что лишь дважды он попадал в период временной опалы у Виктора Шеймана. Вначале, когда умудрился без санкции начальника «выбить» себе служебный «Мерседес» в ведомстве Титенкова, перещеголяв тем самым госсекретаря, который пользовался в то время всего лишь скромной «Волгой». Второй раз попал в немилость, когда находившийся «Мерседес» с находившимся за рулем охранником президента угодил в аварию. Сергей Концевенко отделался легким испугом, а охранник, по некоторым данным, был «сослан» в скандально известную спецслужбу погранвойск — ОСАМ.

Кресло под Концевенко основательно закачалось в начале 1996 года, когда первым заместителем госсекретаря СБ назначается Валерий Кез. В прессу просачивалась информация, что Кез имел какие-то документы, компрометирующие Концевенко. Некоторые источники утверждают, что они были связаны с расследованием хищений в Центральном военном госпитале и попытками лобировать сомнительные сделки с оружием российскими фирмами. Однако, эта информация из разряда слухов в достоверную так и не превратилась.

После так и не возникшего скандала указом президента Кеза увольняют из Совета безопасности и со службы в КГБ. Но, одновременно с ним, в спешном порядке став пенсионером, ретировался из СБ и выехал за пределы Беларуси сам Концевенко. Его недоброжелатели считают, что временно «исчезнуть» ему посоветовал сам госсекретарь, который не хотел «выносить сор из избы». Следы обнаружились спустя полгода в связи с планируемым назначением на должность начальника Главного управления специальных программ — белорусского представительства в Москве, занимающегося вопросами согласования в сфере торговли вооружением. Но видно столь длительное нахождение пенсионера Концевенко в первопрестольной сыграло свою позитивную роль в деле продолжения служебной карьеры в новом качестве.

Помощник госсекретаря г-н Миклашевич не забыл о своем друге и сумел внушить Виктору Шейману мысль о незаменимости Концевенко, который крайне необходим отечеству. С другой стороны понятен выбор «великого немого», который предпочитает работать с теми, на кого есть компромат. В случае проявления строптивости можно тот час же достать заветный «чемоданчик» и тогда дальнейшая карьера чиновника будет окончательно предрешена.

Виктор МИКЛАШЕВ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
4 лютага 1997 г., № 11

КАДРЫ

З 1 лютага Камароўскі рынак у Мінску пачаў гандляваць па новых правілах...

СПОРТ

Нашыя дыяменты ў чужой аправе

БІЯТЛОН: ПЕРШАЯ БРОНЗА

У Славакіі пачаўся чэмпіянат свету па біятлоне. У спрынтарскай гонцы на 10 км бронзавы медаль заваяваў Алег Рыжанкоў з Магілёва. Ён прайграў чэмпіёну, італьянцу Вілфрыду Палхуберу 18 секунд. Калі б не два промахі на другім агнявым рубяжы, Алег мог бы быць чэмпіёнам. У жаночай гонцы на 7,5 км лепшай з беларусак стала Святлана Парамыгіна — 14 месца. На наступны дзень, у нядзелю, адбылася гонка праследавання, у якой біятланісты стартавалі згодна з занятымі напярэдадні месцамі і з тым жа часовым адрывам. Рыжанкоў не змог утрымацца на 3 месцы і прыйшоў на фініш шостым, а Вадзім Сашурын падняўся з 27-й на 11-ю пазіцыю. Аляксандр Папоў быў 26-м, Аляксей Айдараў 34-м. Дзяўчаты выступілі ў гэты дзень вельмі няўдала.

УНІВЕРСІЯДА: СЕМ МЕДАЛЁЎ БЕЛАРУСАЎ

Пяць срэбных і дзве бронзавыя ўзнагароды на рахунку зборнай Беларусі на Сусветных студэнцкіх гульнях, якія праходзілі ў Паўднёвай Карэі. Прызёрамі сталі лыжнік Сяргей Далідовіч, двоебарац Дзмітрый Селязнёў і Сяргей Захарэнка, канькабежац Віталь Навічэнка, а таксама мужчынскія каманды лыжнікаў і двоебарцаў.

ТЭНІС: ТУРНІР АТР

Мінчанін Максім Мірны ў пары з Кэвінам Улетам з ПАР сталі пераможцамі турніру «Сусветнай серыі» Асацыяцый тэнісістаў-прафесіяналаў *(АТР)* у Шанхаі (Кітай) з прызавым фондам 328 тысячаў долараў. У фінале яны выйгралі ў італьянца Пескасаліда і шведа Нідла.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА: РЭКОРДЫ СПРЫНТЭРАЎ

Чэмпіянат краіны па лёгкай атлетыцы, які прайшоў у новым манежы алімпійскага спарткомплексу ў Мінску, адзначыўся двума нацыянальнымі рэкордамі. У бегу на 60 метраў у мужчын Сяргей Карнелюк паказаў час 6,61 секунды, што на сем сотых лепш папярэдняга дасягнення, у жанчын Наталля Сафроннікава скінула з рэкорда на 200 метраў крыху менш чатырох сотых — 23,92.

Вельмі добра скокнуў у даўжыню Аляксандр Главацкі — на 8 метраў 2 сантыметры.

ФУТБОЛ: КУБАК ЧЭМПІЁНАЎ САДРУЖНАСЦІ

Пасля таго, як мазырскі МВКЦ прайграў у групавым турніры ўсе тры матчы і выбыў з барацьбы, беларускім заўзятарам засталося назіраць за сваімі землякамі, якія выступаюць за кіеўскае «Дынама» і маскоўскі «Спартак».

Паўфіналы прайшлі аднолькава напружана і драматычна. «Спартак», гуляючы з ашгабацкім «Капетдагам» толькі за 15 хвілін да фіналу зраўняў лік пасля ўдару іграка зборнай Беларусі Міраслава Рамашчанкі — 1:1. У серыі пасляматчавых пенальці Рамашчанка зноў быў дакладным і масквічы перамаглі — 3:2.

Кіяўляне не змаглі прабіць «жалезабетонную» абарону рыжскага «Сконта» — 0:0 і таксама даказалі сваю перавагу ў серыі пенальці 4:1, прычым адзін з выніковых удараў на рахунку былога мінскага дынамаўца Валянціна Бялькевіча.

Фінал атрымаўся прыгожым, захапляльным і стаў бенефісам Валянціна Бялькевіча. Спартакавец Ягор Цітоў ударам галавы ў падзенні адкрыў лік. Затым Бялькевіч яго зраўняў, а ў хуткім часе за знос яго ў штрафной пляцоўцы «Спартака» арбітар прызначыў пенальці, які рэалізаваў Андрэй Шаўчэнка — 2:1. Незадоўга да канца гульні ўжо дынамаўцы збіваюць Андрэя Ціханава і той ударам з 11-метровай адзнакі ўзнаўляе статус-кво — 2:2. Тут жа Бялькевіч арганізуе атаку на вароты масквічоў і сам жа дабівае мяч у вароты пасля таго, як варатар адбіў папярэдні ўдар Шаўчэнкі — 3:2! Кіяўляне другі год запар сталі ўладальнікамі Кубка чэмпіёнаў краінаў Садружнасці і Балтыі. У іх складзе акрамя Бялькевіча гуляў яшчэ адзін беларус — Аляксандр Хацкевіч. А Рамашчанку прызналі лепшым абаронцам турніру.

ЕЎРОПА — АФРЫКА — 1:2

Зборная Афрыкі па футболе перамагла ў Лісабоне каманду Еўропы — 2:1. Галы забілі ганец Абедзі Пэле (14-я хвіліна), француз Вэнсан Герэн (43) і мараканец Мустафа Хаджы (76). За зборную Еўропы выступалі варатары Ван дэ Сар (Галандыя) і Чэрчэсаў (Расія), палявыя ігракі: Замер, Колер, Мэлер, Клінсман (усе — Германія), Аншо (Швейцарыя), Паўліньо Сантуш, Руй Кошта, Жоао Пінту, Дамінгуш дэ Алівэйра (усе — Партугалія), Недвед (Чэхія), Франк і Роналд дэ Буры (Галандыя), Бобан (Харватыя), Казірагі (Італія). Перамога афрыканцаў над еўрапейцамі — яшчэ адзін доказ таго, што прадстаўнікі Чорнага кантыненту нараўне з футбалістамі Еўропы і Паўднёвай Амерыкі займаюць першыя пазіцыі ў сусветным футболе.

ГАНДБОЛ: ПАСЛЯ РАДАСЦІ — НЕПРЫЕМНАСЦІ

Жаночая зборная Беларусі правяла на мінулым тыдні два матчы кваліфікацыйнага турніру чэмпіяната свету з камандай Літвы. У Вільні перамаглі беларускі — 22:18, а ў Мінску — нашыя суседкі 24:21. Цяпер абедзвюм камандам трэба будзе згуляць па два мачы з камандай Азербайджана.

А нашая мужчынская зборная выязджала ў Люксембург на аналагічныя сустрэчы са слабой зборнай гаспадароў і двойчы лёгка выйграла.

ВАЛЕЙБОЛ:«СПАДАРОЖНІК» ГУБЛЯЕ ВЫШЫНЮ

Валейбалісты віцебскага «Спадарожніка» прайгралі дома чарговы матч групавога турніру Кубка кубкаў італьянскаму «Альпітуру» — 0:3 (5:15, 5:15, 9:15). Італьянцы разам з грэцкім «Алімпіякосам» лідзіруюць у спаборніцтве, выйграўшы ўсе чатыры матчы. Віцебцы перамаглі толькі аднойчы і цяпер дзеляць 6—7 месца ў васьмёрцы каманд.

ФОСЭТ НЕ СУПАКОЙВАЕЦЦА

Стыў Фосэт заявіў, што зноў паспрабуе першым у свеце здзейсніць кругасветнае падарожжа на паветраным шары. 52-гадовы амерыканскі бізнесмен ужо другі раз у гэтым годзе адправіцца — хутчэй за ўсё ў кастрычніку — у рызыкоўнае падарожжа. На мінулым тыдні яго адзіночны кругасветны пералёт не быў закончаны: пераадолеўшы большую частку маршруту (10 тыс. міль, альбо 16 тыс. км за шэсць дзён), ён быў вымушаны прызямліцца ў адным з раёнаў Індыі. На прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным геаграфічным таварыстве Фосэт сказаў, што, нягледзячы на няўдачу, ён настроены аптымістычна. Цяпер ён збіраецца ўзяць больш паліва, паколькі пры першым палёце яму не хапіла прапану.

Сямён ПЛОЦ

КРЫМІНАЛ

Міліцыю выручыў сканфіскаваны спірт

Кіраўнікі міністэрства ўнутраных справаў скардзяцца, што міліцыі даюць на 1997 год толькі 46% ад патрэбнага фінансавання. Так атрымалася, што менавіта настолькі ж працэнтаў гродзенская міліцыя забяспечаная сёння транспартам. Прычым год таму было яшчэ горш, але летась удалося набыць 60 аўтамабіляў. Гэта дзякуючы затрыманаму на чыгуначнай станцыі каля Гродна эшалону кантрабанднага спірту.

Па неафіцыйных звестках, у 28 цыстэрнах змяшчалася спірту больш як на 100 млн долараў. Спірт быў перапрацаваны на гарэлку ў Гродне (якасць яе не вельмі добрая), а даход ад яе рэалізацыі пайшоў ў абласны бюджэт. З гэтай сумы міліцыя таксама атрымала каля 300 тысяч «спірытусовых» долараў. На іх былі купленыя аўтамабілі, камп'ютэры, каскі і бронекамізэлькі для АМОНу. Апроч спірту, летась гродзенская міліцыя сканфіскавала 11 кілаграмаў срэбра, каля аднаго кілаграму золата і амаль тры з паловай паладзія.

АМОН

Гродзенская міліцыя забяспечана прыблізна на 46% не толькі аўтатранспартам, але і іншымі тэхнічнымі сродкамі. Напрыклад, АМОН. Па сведчанні міліцэйскага кіраўніцтва, можна забяспечыць опергрупу толькі з дзесяці супрацоўнікаў куленепрабівальнымі каскамі і бронекамізэлькамі. Астатнія вымушаныя карыстацца камізэлькамі, якія ратуюць толькі ад пісталетнага стрэла, аўтаматная ж куля іх прабівае.

Мяжа

Летась было выяўлена 67 выпадкаў хабарніцтва, але, як прызнаюць самі міліцыянты, гэта менш за дзясятую частку іх сапраўднай колькасці. Сімптаматычна, што большасць такіх выпадкаў зафіксавана на мяжы. Хабар з задавальненнем бяруць мытнікі і памежнікі. Цяпер ідзе следства аб незаконным пропуску цераз польска-беларускую мяжу крадзеных машын. Арыштавана па гэтай справе каля 20(!) чалавек. Сярод іх ёсць і палякі.

Ачышчэнне

Вельмі небяспечная ў сэнсе хабарніцтва і мяжа з Літвой, якая з'яўляецца дастаткова «празрыстай». Па словах міліцэйскага начальства, памежнікі з мытнікамі ўцягваюць у гэтую справу і супрацоўнікаў міліцыі, прычым не толькі шэраговых. Напрыклад, у Ашмянах давялося з гэтай прычыны замяніць практычна ўсё кіраўніцтва РАУС.

Міліцэйская служба ўнутранай бяспекі, якія выяўляе выпадкі парушэнняў і злачынстваў сярод сваіх калег, летась была павялічаная ўдвая — да 6 чалавек. Але і гэтага, як лічаць у абласным УУС, замала.

Між іншым, з прычыны беспрацоўя паявілася вельмі шмат ахвотных служыць у міліцыі. Але цяпер забаронена прымаць асобаў без спецыяльнай адукацыі. Хаця дагэтуль, асабліва на вёсцы, участковымі вельмі часта працавалі аграномы, заатэхнікі, былыя вайскоўцы.

Дысцыпліна

361 супрацоўнік міліцыі летась быў пакараны, большасць з іх афіцэры — 241. У асноўным гэта былі дысцыплінарныя парушэнні (325). Аднак 15 чалавек былі засуджаны ў судах да розных тэрмінаў зняволення.

Амністыя

На Гродзеншчыне падпала пад амністыю каля 500 засуджаных, пераважна з Ваўкавыскай калоніі. Аднак пятай частцы з іх адмоўлена ў гэтым з-за парушэнняў імі рэжыму зняволення. Большасць астатніх — каля 300 ужо выпушчаны на волю.

Летась на Гродзеншчыну вярнулася з месцаў зняволення 2.607 чалавек, прыблізна столькі ж прыязджае кожны год. Пераважна гэта жыхары вобласці, якія раней трапілі за краты. У міліцыі існуе спецыяльная служба, якая імкнецца ўладкоўваць гэтых людзей на працу, аднак у час росту беспрацоўя зрабіць гэта ўсё цяжэй.

Самагубцы і іншыя

За мінулы год на Гродзеншчыне загінула 1.368 чалавек, 425 з іх скончылі жыццё самагубствам. Бывалі дні, калі ў розных мясцінах вобласці, як згаварыўшыся, самахоць развітваліся з жыццём па 5-6 чалавек. У 1995 г. самагубцаў было значна менш — 278.

Шмат было летась і смерцяў ад атручвання — 171, 126 з якіх — ад розных напояў і спірытусовых вадкасцяў. 144 чалавекі загінула на дарогах вобласці, 114 утапілася, а 84 сталі ахвярамі пажараў.

Забойствы

У вобласці за год адбылося 86 забойстваў. Раскрыты яны таксама на 86%. Летась удалося раскрыць чатыры забойствы мінулых гадоў. Дарэчы, з 1955 года (калі, па словах супрацоўнікаў міліцыі, былі ліквідаваны апошнія «лясныя браты») улічваецца колькасць нераскрытых забойстваў. На сённяшні дзень па вобласці такіх справаў налічваецца 57.

Зніклі без весткі

На 369 чалавек былі ў 1996 г. абвешчаны пошукі. На канец года так і не ўдалося высветліць лёс 76 чалавек. Заведзена некалькі крымінальных справаў у тых выпадках, калі ўзнікала падазрэнне аб учыненні забойства.

Справа аб забойстве заведзена, напрыклад, пасля знікнення яшчэ ў 1995 г. намесніка старшыні Свіслацкага райвыканкама Сяргеева. Ён паехаў, нібыта, у Гродна і не вярнуўся. На польскім памежным пункце ў Кузніцы ўдалося знайсці квіток, які сведчыў аб перасячэнні беларуска-польскай мяжы яго аўтамабілям. Пазначана, што ўнутры было дзве асобы, але невядома ці быў сам Сяргееў. Палякі лічаць, што ён выехаў у ФРГ, аднак слядоў пераезду нямецкай мяжы няма.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

Рекламное агентство
MM4
осуществляет полный комплекс полиграфических услуг- от разработки до производства.
Тел: 236-24-41

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 41.100
Нумар падпісаны ў друк 03.02.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 263

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010